Наименование ТВП: Сервечь

© В. Малашевич

Код: BY038

Географические координаты: 55° 00' N 27° 30' E

Административная принадлежность: Витебская область: Глубокский район, Докшицкий район

Площадь: 8200 га

Критерии: A1

Национальный природоохранный статус: гідралагічны заказнік рэспубліканскага значэння «Сэрвач»

Международный природоохранный статус: ТВП міжнароднай значнасці

Общее описание:

Тэрыторыя заказніка ўключае возера Сэрвач і частку поймы ракі Сэрвач. Плошча возера – 450 гектараў, сярэдняя глыбіня – 2,8 метра. Возера моцна зарасло трыснягом, шырыня паласы прыбярэжнай надводнай расліннасці вар’іруе ад 15 да 120 метраў. Берагі на захадзе і поўначы сплавінныя, пераходзяць у нізіннае балота.

Паўднёва-заходняя частка возера вельмі забалочана, з яе выцякае рака Сэрвач. Шырыня яе рэчышча ў межах заказніка вар’іруе ад 2-5 да 15-25 метраў. Шырыня поймы 1-2,5 кіламетры. Пойма возера і ракі ўяўляюць сабой нізіннае асаковае

балота, на якім сустракаюцца як адкрытыя, так і моцна зарослыя хмызнякамі ўчасткі. У некаторых месцах нізіннае балота змяняецца пераходным. З паўночнага захаду да балотнага масіву прылягаюць хваёва-шыракаліставыя і змешаныя лясы.

Тэрыторыя заказніка знаходзіцца непадалёку ад водападзела паміж басейнамі рэк Нёман, Заходняя Дзвіна і Днепр. Рака Сэрвеч упадае ў Вілейскае водасховішча і з’яўляецца адной з важнейшых крыніц, якія фарміруюць баланс Вілейска-Мінскай воднай сістэмы.

На тэрыторыі заказніка ажыццяўляюцца наступныя віды гаспадарчай дзейнасці: торфаздабыча (тут сканцэнтраваны вялікія запасы гідролізнай сыравіны), лесакарыстанне, выпас жывёлы, сенакашэнне, вырошчванне прапашных культур.

Основные биотопы:

Балоты – 85%, лугі – 5%, лясы – 3%, азёры – 5,6%, іншыя землі – 1,4%.

Птицы:

Ў заказніку выяўлена пражыванне двух відаў птушак, якія знаходзяцца пад пагрозай глабальнага знікнення: вяртлявай чаротаўкі *Acrocephalus paludicola* і дубальта *Gallinago media*. Гэта крайняя паўночная кропка распаўсюджання вяртлявай чаротаўкі ў Беларусі.

Сустракаюцца тут і іншыя рэдкія віды, якія прадстаўлены ў табліцы.

Другие группы животных:

Іншыя групы жывел даследаваны не дастакова. З млекакормячых тут адзначаны лось, дзік, ліса, воўк, янотападобная сабака, вавёрка, андатра і іншыя. В возеры Сэрвач і рэках шмат каштоўных відаў рыб.

Состояние редких видов птиц:

Виды	Статус	Количество	Год/период оценки	Точность оценки	Тренды (2002-2010)	Критерий ТВП
Выпь большая *Botaurus stellaris*	гн	+	2010	П		

Виды	Статус	Количество	Год/период оценки	Точность оценки	Тренды (2002-2010)	Критерий ТВП
Коростель *Crex crex*	гн	+	2010	П		
Дупель *Gallinago media*	гн	10 с	2007	Т	↓	
Сова болотная *Asio flammeus*	гн	5-10 п	2002	Э		
Камышовка вертлявая *Acrocephalus paludicola*	гн	31-38 с	2006-2010	Т	↔	А1

Другие редкие и находящиеся под угрозой исчезновения виды:

Расліны: пуханос альпійскі*Baeothryonalpinum*, ласняк лёзеля *Liparisloeselii*, пустапялёснік зялёны *Coeloglossumviride*.

Угрозы:

Забруджванне вады возера стокамі з узараных схілаў.

Выпальванне расліннасці ў веснавы перыяд, асабліва ў сухое надвор’е, наносіць істотную страту біялагічнай разнастайнасці.

Асушэнне тэрыторыі для здабычы торфу.

Рекомендации по сохранению:

Неабходны дадатковыя даследаванні па інвентарызацыі флоры і фауны заказніка, а таксама больш падрабязнае вывучэнне неспрыяльных фактараў.

Источники информации:

Асабістыя паведамленні: Фянчук В.А.

Блакітная кніга Беларусі: энцыклапедыя / рэдкал. Н.А. Дзісько [і інш.]. – Мн., 1994. – с. 359.

Скарбы прыроды Беларусі. – Мн.: Беларусь, 2005. – 215 с. (Інфармацыю падрыхтавалі: Іваноўскі У.В., Мангін Э.А.).

Вертлявая камышевка в Беларуси. Современное состояние популяций. / Под ред. Малашевича В.В. – Минск., 2011. – 20 с.

Составители : Левы С.В.

---

* *Использование размещенной здесь неопубликованной информации для научных публикаций без письменного соглашения ее авторов запрещено. В случае использования части контента или страницы целиком на других интернет-ресурсах, обязательна ссылка на авторов и сайт iba.ptushki.org*